Лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне»

# Культура

Штотыднёвая грамадска-асветніцкая газета

Выдаецца з кастрычніка 1991 г.
№24 (738)
17 – 23 чэрвеня 2006 г.
Кошт
410 руб.



Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА

**16 чэрвеня адбылося ўрачыстае адкрыццё Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — велічнага Храма Ведаў, падобнага якому няма нідзе ў свеце. Сімвалічны ключ ад гэтага унікальнага твору мастацтва архітэктуры Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка перадаў калектыву супрацоўнікаў бібліятэкі...**

Стар. 2

# ДЫЯМЕНТ ВЕДАЎ — СІМВАЛ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ





Аляксандр Лукашэнка аглядае новы будынак бібліятэкі.
Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА.

# Дыямент Ведаў — сімвал сучаснай Беларусі

Апоўдні, пад гукі Дзяржаўнага гімна, урачыстую цырымонію адкрыцця Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі распачаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка. Менавіта яго Указам ад 7 сакавіка 2002 г. быў пакладзены пачатак грандыёзнага будаўніцтва, якое Прэзідэнт курыраваў ад пачатку і да канца. Сам Кіраўнік дзяржавы двойчы працаваў на будоўлі падчас суботнікаў.

— Прымаючы рашэнне аб гэтым будаўніцтве, мы марылі ўзвесці Храм Ведаў, які стане сімвалам нашай маладой незалежнай дзяржавы, — сказаў, звяртаючыся да народа, Аляксандр Рыгоравіч. — Выкананне гэтага важнейшага нацыянальнага праекта яшчэ раз паказала вялікую стваральную сілу беларускага народа, пацвердзіла, што мы моцныя і здольныя на самыя грандыёзныя здзяйсненні. На галоўным праспекце сталіцы зазіхацеў каштоўны Дыямент Ведаў, які ўвасабляе высокую місію Беларусі быць культурным цэнтрам славянства, вытокам дабра і духоўнасці ў самым цэнтры Еўропы, там, дзе злучаюцца Заходняя і Усходняя цывілізацыі.

Прэзідэнт адзначыў, што ўвасабленне ў жыццё незвычайнага па складанасці праекта Нацыянальнай бібліятэкі паслужыла моцным штуршком для развіцця многіх галін айчыннай прамысловасці, дало магчымасць мастакам розных пакаленняў праявіць свае таленты ў поўную моц. У сістэме функцыянавання фенаменальнага будынка задзейнічаны каля 1500 камп'ютэраў, увасоблены самыя перадавыя тэхнічныя магчымасці і дасягненні XXI стагоддзя. Ад імя беларускага народа Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку ўсім стваральнікам новай Нацыянальнай бібліятэкі за самаахвярную працу, энтузіязм і адданасць справе. Ён падкрэсліў, што ў новым будынку і працаваць трэба па-новаму, выкарыстоўваючы самыя сучасныя тэхналогіі і сусветныя інфармацыйныя рэсурсы, заклікаў усіх: "Будзьце годнымі такога выдатнага падарунка, які зрабіла вам краіна, захоўвайце і падтрымлівайце прыгажосць вакол вас!"



Кіраўнік будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Віктар Крамарэнка адрапартаваў Прэзідэнту, што будоўля завершана датэрмінова, і ўручыў яму сімвалічны ключ ад Храма Ведаў. Аляксандр Лукашэнка перадаў яго калектыву супрацоўнікаў бібліятэкі на чале з дырэктарам Раманам Матульскім. Са словамі ўдзячнасці Р.Матульскі ўручыў Аляксандру Рыгоравічу чытацкі білет пад нумарам 1.

Прэзідэнт даў наказ работнікам бібліятэкі: "Людзі павінны ўваходзіць у Храм Кнігі з энтузіязмам, а выходзіць адтуль удвая акрыленымі, атрымаўшы патрэбныя веды".

Кіраўнік краіны ў суправаджэнні міністра культуры РБ Уладзіміра Матвейчука і іншых афіцыйных асоб самым уважлівым чынам азнаёміўся з тым, як працуе новая Нацыянальная бібліятэка. Агляд пачаўся ад стэндаў у фае, якія распавядалі пра этапы будаўніцтва. А.Лукашэнка агледзеў ахоўна-прапускную сістэму, кафедры выдачы дакументаў, замоўленых чытачамі, зрабіў першую замову — кнігу па электронным каталогу, прайшоў па памяшканнях алфавітнага каталога і дапаможнага фонду, слухаючы тлу-







## Тэкст запісу

### Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі ў Кнізе ганаровых гасцей дзяржаўнай установы "Нацыянальная бібліятэка Беларусі"

Паважаныя сябры!

Ад усёй душы віншую вас са знамянальнай падзеяй — адкрыццём новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, ва ўзвядзенні якога брала ўдзел уся краіна.

Гэты унікальны будынак спалучае строгую прыгажосць сучаснай архітэктуры і навейшыя навукова-тэхнічныя рашэнні. Тут прадугледжаны шырокі доступ да сусветных інфармацыйных рэсурсаў, створаны ўмовы для захавання і выкарыстання навуковых і культурных дасягненняў мінуўшчыны і сучаснасці, для працы, адпачынку і правядзення важных міжнародных мерапрыемстваў.

Нацыянальная бібліятэка — увасабленне моцы і працвітання Радзімы, стваральнай сілы і энергіі беларускага народа. Зрабіце ўсё, каб бібліятэка стала адным з галоўных інтэлектуальных і культурных цэнтраў нашай краіны.

Жадаю супрацоўнікам і чытачам бібліятэкі здароўя, поспехаў у працы і вучобе, творчых здзяйсненняў, шчасця і дабра.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА

